УДК 882.6-1.

*Т.І. БОРБАТ*

# ЭПОХА І МАСТАК (ПАЭЗІЯ С. ГРАХОЎСКАГА КАНЦА 1920-х – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1930-х гадоў)

С.І.Грахоўскі ўваходзіў у вялікую паэзію ў яркую і супярэчлівую эпоху. І зразумець яго творчасць можна, толькі ўлічваючы асноўныя заканамернасці развіцця літаратуры канца 1920-х – пачатку 30-х гадоў, самой атмасферы таго часу.

Пры ўсёй складанасці нашых адносін да падзей 20 – 30-х гадоў, калі ўсё новыя і новыя факты сведчаць пра драматычныя старонкі жыцця нашага народа ў гэты перыяд, нельга не верыць і іншым сведкам – успамінам тых, чыя маладосць прыпала на трыццатыя гады.

Па словах Д.Малдоўскага, «людзі на ўсё жыццё захавалі і пранеслі зарыва тых далёкіх гадоў, якія былі напоўнены лепшым, што ёсць у чалавека, – аптымізмам, добразычлівасцю… Гэтаму верыш яшчэ і таму, што «вясна рэспублікі» адлюстравана ў вершах тых часоў». [1, с.9]

Што хвалявала паэтаў у 20-30-я гады? Як адгукалася паэзія на патрабаванні свайго часу?

Газетныя старонкі тых гадоў уражваюць стракатымі назвамі артыкулаў: «Уключым пісьменніка ў сацыялістычнае будаўніцтва», «Сто пісьменнікаў на індустрыяльныя прадпрыемствы і ў калгасы», «Пісьменнікі – вёсцы» і інш.

Сваё галоўнае прызначэнне паэты бачылі ў тым, каб увасобіць у мастацкім слове вобраз чалавека і яго часу. Своеасабліва гучалі і назвы паэтычных твораў: «Урачыстыя дні», «Росквіт зямлі», «Праз шторм – на штурм», «Рабочы пульс», «Гады як шторм», «Гімн барацьбіткі»…

Гэтыя творы адлюстроўвалі гатоўнасць аўтараў аддаць сваё пяро будаўніцтву новага жыцця. Яны даносяць у наша сёння героіку гэтага будаўніцтва, яго дыханне, напружанасць, дынаміку.

Не заўсёды адны паэты знаходзілі дакладныя словы і колеры, іншым не хапала ведання жыцця; трэцім – разумення тых працэсаў, якія вызначалі рух часу. Аднак недастаткова глыбокае веданне жыцця паэты імкнуліся кампенсаваць гучнымі дэкларацыямі, рытарычнымі фігурамі. Лозунг «Пісьменнік – тварам да вытворчасці» спрыяў стварэнню ілюстрацыйнай паэзіі. Разам з тым творы паэтаў 20 – 30-х гадоў паглыблялі ўяўленні сучаснікаў пра эпоху, паказвалі яе маштаб, не перадаючы, аднак, таго драматызму, якім быў адзначаны кожны крок паступальнага руху краіны.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паэты выказвалі працоўны энтузіязм, светлае светаўспрыняцце, крыху высакародную з-за сваёй прамалінейнасці рамантыку, адчувалі энергію, натхненне, паскораны пульс жыцця. Паслухаем іх саміх:

*Эпоха будням лік вядзе*
*На змест свайму календару*
*Вітаю я мой новы дзень,*
*Тваю гарачую пару.*
*Вітаю пройдзены ў баях*
*Пад новым сонцам, родны свет* (Эпоха будням лік вядзе [2,с.192]).

*Вясна! Вясна!...ўдалі пад краем*
*Зара вяргіняю цвіце*
.................................
*Агні гарацъ... Агні ў прасторах...*
*А думы сочацца, плывуць...*
*Ў адну любоў зліемся скора –*
*Ў любоў шырокую, як мора,*
*Дзе шчасце ў вечнасці для ўсіх!* (Першамай [3, с.156]).

Іншы раз складвалася ўражанне, што не паэт размаўляе з чытачом, а ўся краіна звяртаецца да чалавецтва, расказвае пра сябе.

Святочная атмасфера цяжкай, але шчаслівай маладосці, станаўленне камсамольскай паэзіі, усяго жыцця «краіны-падлетка» вызначылі і атмасферу першых паэтычных вопытаў С.Грахоўскага. Гэта былі яшчэ толькі спробы пяра. Голас паэта як бы зліваецца з агульным хорам паэзіі канца 20-х – пачатку 30-х гадоў. У маладога паэта яшчэ няма свайго паэтычнага зроку, свайго стылю. Адсюль такія зразумелыя, такія натуральныя, знаёмыя радкі, што сустракаюцца ў яго вершах.

Па сваёй ідэйнай накіраванасці, асноўнаму зместу, агульнаму эмацыянальнаму ладу лірыка С.Грахоўскага блізка стаіць да творчасці маладнякоўцаў. У іх шмат агульнага – і перш за ўсё ў тэматыцы твораў, у характары вобразаў, у падыходзе да з'яў жыцця, у спосабе адлюстравання рэчаіснасці. Прыгадаем радкі В.Маракова:

*О, выходзь, маладняцкая раць,*
*На прасторах маёўкі спраўляць!*
*Наша сонца сягоння гарыць*
*Цветам яркай румянай зары*
*Па прасторах зялёных палёў*
*Ўсё цвіце – расцвітае, жыве,*
*Ўсюды радасць і звон галасоў,*
*Ўсіх прыволле сягоння заве* (О, выходзь, маладняцкая раць [4, с.32]).

Ва ўнісон гучаць радкі С.Грахоўскага:

*Усміхаюцца вуліцы нашай хадзе,*
*раньне целы хварбуе сонечным*
*пылам*
*І ў кожным уздыме гарачых*
*грудзей*
*Наша песьня і наша сіла*
*Мы моцнымі вышлі на сустрач*
*гадоў,*
*у шчыльных і стройных калёнах* (Пачынаецца дзень. У Сем... [5, с.4]).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Іх аб'ядноўвае бадзёры настрой, урачыста-святочны тон, радасна-ўзнёслы пафас услаўлення перамен.

Перад маладымі паэтамі не стаяла пытанне аб суадносінах свайго «я» з рэвалюцыяй. Для іх, дзяцей сялян і рабочых, яна адкрыла шлях у «новы» свет, дала свабоду і прастор для выяўлення творчых здольнасцей. І адсюль зразумела іх шчырае жаданне дапамагчы сваім натхнёным словам умацоўваць рэвалюцыйныя заваёвы.

Творчасць С.Грахоўскага канца 20 – пачатку 30-х гадоў не з'яўляецца чымсьці выключным з пункту гледжання тэматыкі вершаў. Паэт вітае вясну новага жыцця, маладосць, захапляецца чалавекам працы ("Чацвёртая вясна", «Героі перамог», «Ільнаводу», «Так пачнецца вясна», «Ветры-буйнавеі», «Турксіб», «Гідрастанцыя», «Песня пра чэлюскінцаў», «Калгасная радасць»).

Пра ўсё ўбачанае і перажытае С.Грахоўскі пісаў у стылі свайго часу, каротка, дакладна, аператыўна. Паэт шчыра перадае праўду пачуццяў сваіх сучаснікаў, іх жыццярадаснасць, бадзёрасць. Лірычны герой вершаў успрымае свет з захапленнем, адкрыта, крыху наіўна. Імклівасць часу, яго бег адчуваецца ў рытме верша, яго інтанацыі. Кароткія радкі таксама перадаюць парывістасць пачуццяў, безупыннае імкненне героя да дзеяння:

*Як узнімецца вецер,*
*і прыйдзе ноч,*
*сьнег паточаны шашалем сонца*
*растане*
*і прымчыцца з вясною,*
*як дальні госьць,*
*як дэпеша,*
*у колгас –*
*пасяўная* (Так пачнецца вясна [6, с 6]).

Адчуваецца, што герой улюблёны ў свет, перапоўнены энергіяй, шчаслівы чым-небудзь дапамагчы краіне. Ён падпарадкоўваецца рытму часу, заўсёды ў дарозе, імкнецца не страціць сваё месца ў агульнай перабудове свету. Аднак лірычны герой многіх ранніх вершаў паэта, яшчэ не сфарміраваны як натура, быў часам абагулены і сканструяваны (Рабочая Марына – «Чацвёртая вясна», калгасніца-ільнавод – «Ільнаводу», піянер Барасбі – «Барасбі»). Характар герояў у гэтых творах не раскрываецца, не дадзена іх партрэтная характарыстыка, а ў выніку мы не можам уявіць сабе іх як жывых людзей, з поўным абліччам і індывідуальнымі рысамі характару.

Аналізуючы паэтычныя творы канца 20-х – пачатку 30-х гадоў, літаратуразнаўцы не раз звярталі ўвагу на тое, «што ствараючы вобраз станоўчага героя тагачасная паэзія не заўсёды ўлічвала канкрэтнасць яго асобы, глыбіню, псіхалогію, індывідуальнасць характару, што вяло да ігнаравання яго душэўнага жыцця...» Так тэндэнцыі да схематызацыі і празмернай абагуленасці пераважалі над імкненнем да індывідуальнага аналізу [7, с.53].

Мажорнасць, жыццярадаснасць у ранніх вершах С.Грахоўскага спалучаліся з рытарычнасцю і парадн асцю. Радасна вітаючы новае, паэт звяртаецца да яркіх эпітэтаў і метафар, якія замест канкрэтнай мастацкай вобразнасці надаюць вершам плакатнасць:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Дзень пачаўся
*ударных* работ,
Дзень абсыпаны сонцам і
шчырасцю песень,
Дзень гудзе,
як нацягнуты цяжарам дрот,
Дзень гудзе па ўдарным паверсе
Сінь пранізана сонцам навылет (Пачынаецца дзень У Сем... [5, с.4]).

Але побач з такімі творамі, у якіх вобразы герояў пададзены ў плане рамантычна-сімвалічнай абстракцыі, ёсць творы апавядальна-эпічнага складу, якія маюць рэальную жыццёвую аснову. Так, у вершы «Героі перамог» (1931) аўтар распавядае пра аварыю на бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце, дзе сам працаваў рабочым з 1930 па 1931 год. Твор набывае амаль дакументальны характар. Аднак рэалізм і ў гэтым вершы не з яўляецца творчым метадам у «поўным» сэнсе слова. Рэалістычнасць твора, на нашу думку, чыста вонкавая, пераважае апісальніцтва, бясстрасная ілюстрацыйнасць.

Такім чынам, у ранніх вершах С.Грахоўскага перададзена перш за ўсё эмацыянальнае адчуванне часу, знойдзены адпаведныя рэальныя вобразы і яркія фарбы – «качагары з вачыма з агню», «маёвыя вятры», «сонечны пыл», «сталёвыя камсамолкі», «паласатыя майкі», «вятры пужлівыя», «дзень асыпаны сонцам», «пажоўклыя вусны» і інш.

Па такіх даверлівых творах можна скласці абагулены партрэт пакалення тагачаснай моладзі. С.Грахоўскі імкнуўся па-свойму адлюстраваць час. Аднак ранняя лірыка паэта не была праблемнай.

Калі паспрабаваць вызначыць асноўную рысу яго паэзіі, то гэта – прастадушнасць і шчырасць, якія знаходзяць сваё ўвасабленне ў простай, «апавядальнай» форме верша. Для паэта з'яўляецца характэрнай нават некалькі знарочыстая спрошчанасць структуры страфы, што складаецца з простых інфармацыйных сказаў, без інверсій, без выдзялення націскных апорных слоў, з гладкай і па-сутнасці не вельмі багатай паэтычнай лексікай. Безумоўна, было б неправамерна ў творчасці маладога паэта шукаць нейкіх складаных філасофскіх і вобразна-сінтаксічных канструкцый. Ад верша да верша С.Грахоўскі распавядае паэтычную біяграфію свайго сучасніка, з юнацкай непасрэднасцю раскрывае настрой і пачуцці моладзі.

Але ж спроба адлюстраваць час у ранніх паэтычных творах С.Грахоўскага яшчэ не магла зліцца з задачай выяўлення лірычнага «хвалявання». «Калі чытаеш лірычныя творы 20-х – пачатку 30-х гадоў, здаецца, што паэты глядзелі на жыццё з вышыні сацыялістычных будоўляў. Яны добра бачылі сучаснасць у агульных рысах, галоўны напрамак яе развіцця, тыповыя арыенціры і прыкметы новага. Але складанасці рэчаіснасці заставаліся дзесьці па-за межамі лірычных тэм. Як бы інтанацыйна разнастайна не гучала тэма радасці [...] усё ж *такі* гэта *была па сутнасці* толькі *адна* тэма, якую не *парушалі* ні роздум, ні хваляванні, ні драматызм, што быў часам народжаны сутыкненнем асобных чалавечых лёсаў з агульнай хадой гісторыі. Уся разнастайнасць маральных праблем, звязаных з нараджэннем новага свету, зводзілася фактычна да аднаго настрою ваяўнічай радасці-вяселля» [8, с.103-104].

Сапраўды, асаблівасць тагачаснай паэзіі – імкненне мастакоў насыціць вершы рэальнымі прыкметамі часу, прыкметамі жыцця. Паэты прама гаварылі пра сваю прыналежнасць да ўсяго, вялікага і малога, з жыцця народа. Гэта ў першую чаргу было звязана з маладосцю паэтаў, з іх часам безаглядна-шчаслівым і бескампрамісным суджэннем, светлым поглядам на жыццё, калі ўсё яшчэ наперадзе і не палохаюць ніякія перашкоды.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Горкая праўда эпохі, складанай і супярэчлівай, была тады невядома не толькі маладым. У краіне панаваў настрой усеагульнага дабрабыту, прамалінейныя ўяўленні пра існаванне ў жыцці канфліктаў толькі класавага паходжання. Гэта прывяло да таго, што ў цэнтры ўвагі мастакоў стаў не столькі герой – характар, колькі герой – ідэя. Будаўнік новага свету становіцца героем эпохі. І чытач сустракае ў вершах эскізы і замалёўкі, павярхоўны нарысізм, калі інфармацыя пераважае над аналізам.

На літаратуру 30-х гадоў адмоўна паўплывала грамадская атмасфера культу асобы, тэндэнцыі адміністравання і суб'ектывісцкага самавольства. Больш таго, паэзія зведала на сваім шляху нямала цяжкасцей, звязаных з памылковай тэорыяй «адмірання лірыкі», арыентацыяй выключна на агітацыйны верш, недаверам да эмацыянальнага элементу ў паэзіі, да «класічных» форм і сродкаў вобразнасці.

Жанравую своеасаблівасць лірыкі складалі вершы-рэпартажы, звароты, лозунгі, якія недастаткова насычаліся эмацыянальна і псіхалагічна. Такія творы, напісаныя на "злобу дня", ёсць і ў С.Грахоўскага. Напрыклад, верш «Барасбі», у якім піянер Барасбі вітае таварыша Сталіна.[1] Менавіта час дыктаваў паэту такія вершы. Цяжка сказаць, што ў тыя гады Грахоўскі думаў пра сталінізм, магчыма, аб'ектыўнай ацэнкі таго, што адбывалася ў краіне, у свядомасці паэта яшчэ не было. Ці дзейнічае ў дзяржаве варожая народу палітычная сіла, што парушае сацыялістычную законнасць (і ці ёсць тады межы гэтага беззаконня) – пра ўсё гэта ў тыя гады меркаваць было вельмі складана. Нават сталыя мастакі пры асэнсаванні эпохі сутыкаліся з цяжкасцямі філасофскага плану.

Кроў і пот – гэта таксама рысы эпохі. Пазней Сяргей Іванавіч зразумее гэта, прайшоўшы праз турмы і сібірскія лагеры. І ў вершах 90-х гадоў мы ўбачылі іншы бок эпохі канца 20-х – пачатку 30-х гадоў.

Такім чынам, не ўсё з ранніх твораў С.Грахоўскага вытрымала выпрабаванне часам і на мастацкасць. Не ўсё было арганічным, цэласным. Ян Скрыган успамінае: «Я меў выпадак, даволі доўгі час – не адзін год – наглядаць, як Грахоўскі рыхтаваў двухтомнік сваіх выбранных вершаў. На ранейшыя тэксты было нядобра глядзець, бадай, што ўсе яны былі скрэслены, каторы менш, а каторы да таго, што ад яго мала што ранейшае аставалася. І ў выбраныя творы паэт уключыў толькі адзін колішні верш, датаваны 1934 годам, прапусціўшы ў сваёй творчасці цэлыя дзесяцігоддзі» [9, с.4].

Мастак сапраўды адабраў усё лепшае, цэласнае і завершанае. Аднак не пакідае адчуванне некаторай непаўнаты. Дзе ж знайсці цяпер, калі не дакапаешся да першых публікацый у тагачасных газетах і часопісах, характэрныя для маладога Грахоўскага радкі, без якіх творчае аблічча паэта нешта страчвае? Мы будзем неашчаднымі да вопыту і набыткаў нашай паэзіі, калі забудзем усё гэта і «спішам у літаратурны архіў усё тое, што так звонка гучала, натхнялася часам і натхняла час, тут не адны толькі лозунгі, тут – энергія ўвасабляемага ў жыццё ідэалу, сацыяльная радасць вызваленых ад прыгнёту людзей» [10, с.13].

Так, нягледзячы на рыторыку і ілюстрацыйнасць, раннія творы С.Грахоўскага дапамагаюць нам у разуменні сутнасці часу і рамантыкі 20-х – пачатку 30-х гадоў, паглыбляюць наша ўяўленне пра эпоху, паказваюць яе маштаб, дапамагаюць зразумець праўду пачуццяў тагачаснага пакалення моладзі. Радасны, поўны гукаў і колераў, час уваходзіў у душу маладога паэта, дыктаваў

[1] Па іроніі лёсу гэты твор быў надрукаваны 27 лютага 1936 года ў газеце «Піянер Беларусі», калі паэт сядзеў ужо ў Мінскай турме.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жыццясцвярджальныя вершы. Менавіта час напаўняў яго паэзію гістарычнай канкрэтнасцю, вызначаў настрой, рытм верша.

Такім чынам, інтанацыі эпохі гучаць амаль ва ўсіх ранніх паэтычных творах мастака, бо ўнутраны свет душы маладога Грахоўскага і хада эпохі ў канцы 20-х – пачатку 30-х гадоў былі сугучны.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Молдавский Д.В.*** В начале тридцатых. – Л., 1984.
2. ***Хадыка У.*** На ўзвеях дзён: Вершы. – Мн., 1986.
3. ***Трус П.*** Выбраныя творы. – Мн., 1946.
4. ***Маракоў В.*** Вяршыні жаданняў: Вершы, паэмы. Успаміны пра аўтара. – Мн., 1989.
5. ***Грахоўскі С.*** Пачынаецца дзень У СЕМ...// Чырвоная Беларусь. – 1932. – №10.
6. ***Грахоўскі С.*** Так пачнецца вясна // Чырвоная Беларусь. – 1932. – №4.
7. ***Гніламёдаў У.В.*** Сучасная беларуская паэзія: Творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс. – Мн., 1985.
8. ***Бузник В.В.*** Лирика и время. – М.-Л., 1964.
9. ***Скрыган Я.*** Адданасць // ЛіМ. – 1983. – 23 верасня.
10. ***Бечык В.*** Прад высокаю красою... Літаратурна-крытычныя артыкулы. – Мн., 1984.


ный архив библиотеки МГУ имени А.А.